УДК 378.095 (430)

# АСАБЛІВАСЦІ ПАДРЫХТОЎКІ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ ДЛЯ АПК ГЕРМАНІІ

**В. М. Босак[1], Т. У. Сачыўка[2]**
[1)]Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт
[2)]Беларуская дзяржаўная сельскагаспадарчая акадэмія

**Анатацыя.** Прыведзены структура і асаблівасці падрыхтоўкі ва ўніверсітэце Хаэнхайм (Германія). Разгледжаны структура ўніверсітэта і факультэтаў, асаблівасці падрыхтоўкі спецыялістаў па сельскай гаспадарцы ў бакалаўрыяце, магістратуры і аспірантуры.

**Ключавыя словы:** сельская гаспадарка, бакалаўрыят, магістратура, аспірантура, універсітэт.

# ОСОБЕННОСТИ ПОДГОТОВКИ СПЕЦИАЛИСТОВ ДЛЯ АПК ГЕРМАНИИ

**В. Н. Босак[1], Т. В. Сачивко[2]**
[1)]Белорусский государственный технологический университет (Беларусь, 220006, Минск, ул. Свердлова 13а; e-mail: bosak1@tut.by)
[2)]Белорусская государственная сельскохозяйственная академия, (Беларусь, 213407, Горки, ул. Мичурина, 5; e-mail: sachyuka@rambler.ru)

**Аннотация.** Приведены структура и особенности подготовки в университете Хоэнхайм (Германия). Рассмотрены структура университета и факультетов, особенности подготовки специалистов по сельскому хозяйству в бакалавриате, магистратуре и аспирантуре.

**Ключевые слова:** сельское хозяйство, бакалавриат, магистратура, аспирантура, университет.

# PECULIARITIES OF SPECIALISTS TRAINING FOR AGRICULTURE IN GERMANY

**V. M. Bosak[1], T. U. Sachyuka[2]**
[1)]Belarusian State Technological University (Belarus, 220006 Minsk, Sverdlova str. 13a; e-mail: bosak1@tut.by)
[2)]Belarusian State Agricultural Academy, (Belarus, 213407 Gorki, Michurina srt. 5; e-mail: sachyuka@rambler.ru)

**Summary.** The article describes the structure and peculiarities of teaching at the University of Hohenheim (Germany), namely the structure of the University and its faculties, peculiarities of training of the specialists in

agriculture in undergraduate, graduate and post-graduate programs.

**Key words:** agriculture, bachelor studies, magister studies, PhD course, university.

Падрыхтоўка спецыялістаў для аграпрамысловага комплексу ў Германіі адбываецца на трох асноўных ступенях: пасля заканчэння галоўнай школы – у прафесійных школах (адпавядае беларускай прафесійна-тэхнічнай адукацыі), пасля заканчэння рэальнай школы – у прафесійных каледжах (адпавядае беларускай сярэдняй спецыяльнай адукацыі), пасля заканчэння гімназіі – у вышэйшай навучальнай установе (універсітэт, акадэмія ці спецыялізаваны інстытут). Пры адпаведных стасунках пасля заканчэння прафесійнага каледжа і вытрымкі экзаменаў за курс сярэдняй школы, магчымы працяг вучобы ў вышэйшай школе (перш-наперш у спецыялізаваным інстытуце).

Пасля далучэння Германіі да Балонскага працэсу, больш за 80 % вышэйшых навучальных устаноў перайшлі на падрыхтоўку спецыялістаў у бакалаўрыяце (6 семетраў) і магістратуры (4 семестры). У асобных вышэйшых навучальных установах захавалася традыцыйная падрыхтоўка спецыялістаў – пасля 9–10 семестраў навучання выпускнікі атрымліваюць дыплом спецыяліста (у галіне АПК – дыплом інжынера сельскай гаспадаркі).

Старэйшай вышэйшай сельскагаспадарчай навучальнай установай Германіі з’яўляецца ўніверсітэт Хаэнхайм (Штутгарт, Федэральная зямля Бадэн-Вюртэмберг), які заснаваны ў 1818 г.

На дадзены момант універсітэт Хаэнхайм складаецца з трох факультэтаў (факультэт сельскагаспадарчых навук, факультэт прыродазнаўчых навук, факультэт эканамічных і сацыяльных навук).

У 2014 г. ва ўніверсітэце адбывалася падрыхтоўка болей 9800 студэтаў (у тым ліку больш за 1300 іншаземцаў) па 12 спецыяльнасцях бакалаўрыяту, 25 спецыяльнасцях магістратуры, 9 асобных спецыяльнасцях (дыплом спецыяліста), у дактарантуры (аспірантуры) па сельскагаспадарчых, біялагічных і эканамічных навуках.

Падрыхтоўка ў бакалаўрыяце вядзецца ў асноўным на нямецкай мове, у магістратуры – на англійскай і нямецкай мовах, дысертацыі рыхтуюцца на нямецкай ці англійскай мове [1–3].

На факультэце сельскагаспадарчых навук у бакалаўрыяце падрыхтоўка здзяйсняецца па спецыяльнасцях “аграбіялогія”, “сельская гаспадарка”, “аднаўляемыя рэсурсы і біяэнергетыка”, у магістратуры – “сельская гаспадарка” (накірункі – раслінаводства, жывёлагадоўля, сельскагаспадарчая тэхніка, глебазнаўства, аграэканоміка), “аграбізнес”, “сельская гаспадарка ў тропіках і

субтропіках”, “дакладнае земляробства”, “ахова навакольнага асяроддзя і вытворчасць прадуктаў харчавання”, “экалогія глебаў, водных і біялагічных рэсурсаў”, “аграэкалогія”, “аднаўляемыя рэсурсы і біяэнергетыка”, “арганічнае земляробства”, “біяэканоміка”.

Для паступлення на спецыяльнасць “сельская гаспадарка” патрабуецца сярэдняя адукацыя (гімназічны ці адпаведны яму ўзровень), а таксама папярэдняя 8 тыднёвая практыка на сельскагаспадарчых прадпрыемствах і праходжанне тэста на прафесійную годнасць. Уступных экзаменаў ці тэстаў не праводзіцца, колькасць месцаў не абмежавана.

Падрыхтоўка па спецыяльнасці “сельская гаспадарка” ў бакалаўрыяце працягваецца 6 семестраў. Студэнт за гэты час павінен набраць не менш за 180 крэдытаў (прыблізна 30 крэдытаў за семестр, 1 крэдыт – 25–30 гадзін, 1 модуль – 6 крэдытаў).

У 1–4 семестрах студэнты вывучаюць агульнаадукацыйныя і профільныя дысцыпліны (20 модуляў), у 5–6 семестрах адбываецца паглыбленая падрыхтоўка па адной са спецыялізацый (раслінаводства, жывёлагадоўля, аграэканоміка, сельскагаспадарчая тэхніка, глебазнаўства – 5 абавязковых модуляў і не менш за 3 вольныя модулі), падрыхтоўка і абарона работы бакалаўра (12 крэдытаў).

Падрыхтоўка ў магістратуры працягваецца 4 семестры. Студэнт за гэты час павінен набраць не меней 120 крэдытаў. Першыя тры семестры магістранты праходзяць паглыбленую падрыхтоўку па сваёй спецыяльнасці і накірунку, у чацвёртым – рыхтуюць і абараняюць магістэрскую работу (30 крэдытаў).

Уся падрыхтоўка грунтуецца на поўнай самастойнасці студэнтаў – агульнага раскладу заняткаў, студэнцкай групы ці нават курса не існуе – кожны студэнт складае для сябе індывідуальны расклад заняткаў, выбірае модулі і час іх вывучэння, самастойна рэгіструецца для вывучэння модуля на адпаведнай кафедры (інстытуце) і правядзення экзамена пасля атрымання допуску ў спецыяльнай экзаменацыйнай службе.

Пасля заканчэння магістратуры суіскальнікі могуць працягнуць падрыхтоўку ў дактарантуры (3 гады) па любых напрамках дзейнасці ў галіне сельскай гаспадаркі.

ЛІТАРАТУРА

1. Agrarwissenschaften (Bachelor of Science): Studienplan. – Stuttgart: Universität Hohenheim, 2015. – 24 S.
2. Agrarwissenschaften (Master of Science): Studienplan. – Stuttgart: Universität Hohenheim, 2015. – 24 S.